4) аптымізацыя зместу курса "Музычная педагогіка", "Псіхалогія мастацкай творчасці", магчыма ўвядзенне курса "Музычная псіхалогія";

5) семінары па афармленні дакументацыі;

6) арганізацыя "творча-педагагічных лабараторый", "майстар-класаў".

**Л.Г.Кірухіна,**
**нам. дырэктара па навуковай рабоце**
**Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**

# УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ ЯК БАЗЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адной з галоўных праблем культуры з'яўляецца забеспячэнне яе ўстаноў прафесійна падрыхтаванымі кадрамі. Вырашэнне гэтага пытання патрабуе ад дзяржавы пастаянных увагі і клопату.

Па дадзеных Міністэрства культуры, на канец 1999 г. у рэспубліцы маецца 35431 штатная пасада спецыялістаў і кіраўнікоў сферы культуры. Запоўнены з іх — 33794 месцы. Вакансій — 1637 (4,6%). Вышэйшую адукацыю маюць 11068 (31,2%) работнікаў, сярэднюю спецыяльную — 17213 (48,6%). Пенсійнага ўзросту дасягнулі 1910 чалавек (6%). Між тым назіраецца паляпшэнне якаснага складу спецыялістаў. Так, напрыклад, нягледзячы на скарачэнне клубных устаноў, колькасць спецыялістаў павялічылася з 8188 чалавек у 1990 г. да 9758 у 1999 г. Вырасла колькасць спецыялістаў з прафесійнай падрыхтоўкай — з 53,8% у 1990 г. да 59% у 1999 г.

Сацыяльна-культурныя пераўтварэнні ў краіне немагчымы без спецыялістаў новай генерацыі, якім трэба будзе вырашаць існуючыя праблемы, ствараць спрыяльныя ўмовы для далейшага развіцця культуры з улікам набытых ведаў, навы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў, уменняў. Таму выпрацоўка кадравай стратэгіі ў галіне культуры — адна з першачарговых задач Міністэрства культуры.

Установы культуры, да якіх мы адносім бібліятэкі, клубы, музеі, архівы, займаюць для кожнага чалавека значнае, калі не сказаць болей, месца ў жыцці. Яны адыгрываюць адметную ролю ў станаўленні і прафесійнай падрыхтоўцы будучага спецыяліста ў час праходжання вытворчай і пераддыпломнай практыкі.

Трэба адзначыць, што сацыякультурныя ўстановы захавалі даволі трывалую інфраструктуру, узначальваюць якую на верхнім узроўні ўстановы з нацыянальным статусам. Менавіта яны вельмі актыўна выкарыстоўваюцца ў якасці асноўных баз практыкі. Далей ідуць установы рэспубліканскага ўзроўню, установы г. Мінска, абласныя і раённыя. Апошнія, на жаль, амаль зусім не выкарыстоўваюцца як базы практыкі.

Ва ўмовах шматузроўневай сістэмы падрыхтоўкі кадраў у Беларускім універсітэце культуры вытворчая практыка здзяйсняецца на IV і V курсах (перадвыпускным і выпускным). Аналізуючы практычную дзейнасць у працэсе кіраўніцтва практыкай студэнтаў, можна схематычна вызначыць яе мадэль і некаторыя агульныя рысы для ўсіх устаноў культуры.

Па-першае, мадэль практыкі ўяўляе сабой сістэму дзеянняў і ўзаемадзеянняў студэнтаў, выкладчыкаў Беларускага універсітэта культуры і спецыялістаў сацыякультурнай сферы. Агульныя намаганні накіраваны на фарміраванне будучага спецыяліста ў працэсе вытворчай дзейнасці. Сістэма ўзаемадзеянняў дэманструе ўмовы аптымальнага развіцця ўдзельнікаў гэтага працэсу, але ў першую чаргу асабістага, прафесійнага развіцця студэнтаў. Калі гэта мадэль працуе гарманічна, то і вынікі на практыцы атрымліваюцца станоўчыя.

Па-другое, у цэнтры ўвагі ўстановы культуры знаходзіцца складаны і мнагапланавы працэс адаптацыі будучага спецыяліста (бібліятэкара, культасветработніка, архівіста, музеё-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лага) да практычнай дзейнасці. На працягу яго адбываецца засваенне новага сацыяльнага статуса, які прадугледжвае перабудову індывідуальнага вобраза жыцця, уваходжанне ў сістэму новых міжасобасных зносін, прыстасаванне да нормаў і патрабаванняў новага калектыву, выпрацоўку індывідуальнага стылю дзейнасці. Зразумела, што менавіта ў гэтым кантэксце значнае месца ў падрыхтоўцы будучага спецыяліста належыць практыцы і яе базе — першаснаму асяроддзю для выпрабаванняў будучых прафесійных якасцей маладога спецыяліста.

Глыбокія змены, якія адбыліся ў практычнай дзейнасці бібліятэк і інфармацыйных установ нашай краіны, абумоўлены аб'ектыўнымі прычынамі і патрабавалі пераасэнсавання бібліятэчнай вышэйшай адукацыі, распрацоўкі новых падыходаў да падрыхтоўкі бібліятэчна-інфармацыйных кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Паўсюднае ўкараненне ў практыку работы бібліятэк сучасных інфармацыйных тэхналогій патрабавала ад факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (ФБІС) Беларускага універсітэта культуры перагляду падрыхтоўкі спецыялістаў. Нагадаю некаторыя лічбы. Зараз толькі па статыстычных даных Міністэрства культуры рэспублікі камп'ютэрызавана каля 60% бібліятэк, пры гэтым цалкам — бібліятэкі Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Для неадкладнага вырашэння праблем інфарматызацыі галіны на рэспубліканскім узроўні пры Беларускім інстытуце праблем культуры пачалася перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі працуючых кадраў па зацверджанай Міністэрствам культуры праграме.

З улікам прапаноў Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, буйнейшых бібліятэк краіны ўнесены адпаведныя змены і ў змястоўны аспект практыкі. Робіцца гэта на канферэнцыях і круглых сталах, якія праводзіць Беларускі універсітэт культуры з удзелам бібліятэчнай грамадскасці. На іх абмяркоўваюцца новыя спецыялізацыі ФБІС, адукацыйныя стандарты, колькасны і якасны стан кадраў і патрэбы бібліятэк. Мэтана-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кіраваныя дзеянні станоўча паўплывалі не толькі на ўзровень падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў, але нават зрабілі нашу спецыяльнасць канкурэнтаздольнай на працоўным рынке, што не можа сёння не клапаціць практыкаў, таму што выпускнікі не заўсёды трапляюць у бібліятэкі пасля заканчэння універсітэта. Вызначыліся больш значныя базы практыкі, сярод якіх ЦНБ НАН, РНТБ, Прэзідэнцкая бібліятэка, БелСГБ, РНМБФК, Фундаментальная бібліятэка БДУ, ЦБС г. Мінска. У сувязі з наяўнасцю вакантных месцаў гэтыя бібліятэкі прадастаўляюць магчымасць студэнтам часовага працаўладкавання.

Буйнейшай у рэспубліцы комплекснай базай практыкі з'яўляецца Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ). Яна ж — база стажыроўкі магістрантаў, аспірантаў і выкладчыкаў універсітэта. Члены дырэкцыі бібліятэкі ўзначальваюць дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі на выпускных экзаменах ФБІС. У арсенале супрацоўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Беларускага універсітэта культуры рэцэнзаванне спецыялістамі бібліятэкі навуковых і дыпломных работ студэнтаў, дысертацый аспірантаў, вучэбных праграм і стандартаў, вучэбных дапаможнікаў, сумесная праца па стварэнні нацыянальных праграм, стандартаў, сумесная даследчая дзейнасць і інш. Усе вышэйназваныя аспекты, безумоўна, знаходзяць адлюстраванне ў змесце практыкі студэнтаў IV і V курсаў. Для яе праходжання на падставе дамоўленасці паміж Беларускім універсітэтам культуры і НББ ствараюцца графікі работы, вызначаюцца кіраўнікі па асноўных напрамках дзейнасці бібліятэкі. Агульнае кіраўніцтва замацоўваецца за намеснікам дырэктара. Практыка студэнтаў IV курса па тэрмінах непрацяглая (2 месяцы) і скіравана на агульнае знаёмства з НББ, азнаямленне з такімі асноўнымі яе функцыямі, як фарміраванне фондаў, апрацоўка дакументаў, стварэнне даведачна-інфармацыйнага апарату, абслугоўванне карыстальнікаў, у тым ліку па МБА. На V, выпускным курсе адбываецца больш паглыбленае знаёмства з арганізацыяй бібліятэч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най справы ў рэспубліцы, — заканадаўчай і нарматыўна-рэгламентуючай базай, з тэхналагічным менеджментам. Ствараюцца ўмовы ў адпаведных падраздзяленнях для практычнай работы на аўтаматызаваных рабочых месцах па канкрэтных бібліятэчных пытаннях. Студэнты актыўна займаюцца навукова-даследчай і навукова-метадычнай дзейнасцю. Так, толькі на працягу 1998—1999гг. з дапамогай студэнтаў праводзіліся лакальнае сацыялагічнае даследаванне па вывучэнні чытацкага попыту на замежную перыёдыку ў НББ і комплекснае сацыялагічнае даследаванне па вывучэнні вольнага часу сельскіх жыхароў Мінскай вобласці з мэтай выпрацоўкі аптымальнай мадэлі сельскай установы культуры. Актыўны ўдзел прымаюць студэнты ў маркетынгавай дзейнасці бібліятэкі — распрацоўваюць бібліятэчную рэкламу, ствараюць прэс-рэлізы і інш. У навукова-метадычнай дзейнасці адбываецца практычная праверка аналітычных здольнасцей студэнтаў. Яны робяць аналізы статыстычных даных абласных і публічных бібліятэк рэспублікі, знаёмяцца з навукова-бібліяграфічнай дзейнасцю НББ, з бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэк рэспублікі. Далучэнне да такой працы дапамагае не толькі самавызначэнню навуковага інтарэсу, які выліваецца спачатку ў навуковую курсавую, потым у дыпломную работу, але і дае магчымасць паглыбіць вучэбны працэс, унесці ў яго цікавыя напрацоўкі. У час практыкі пры абслугоўванні карыстальнікаў праходзяць выпрабаванне камунікатыўныя здольнасці будучых спецыялістаў. Адначасова адбываецца і прыстасаванне да нормаў і патрабаванняў працоўнага калектыву. Інакш кажучы, студэнт праходзіць адаптацыйны перыяд.

Цікавай і карыснай для ўсіх бакоў з'яўляецца працэдура падвядзення вынікаў практыкі, на якой звычайна прысутнічаюць і выступаюць студэнты, выкладчыкі і бібліятэчныя спецыялісты.

Вопыт практычнай дзейнасці ў арганізацыі практыкі студэнтаў дазваляе зрабіць некаторыя прапановы па яе аптымізацыі. Бачыцца мэтазгодным увесці скарочаную па тэр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мінах азнаямляльную практыку ў канцы III курса. Неабходна змяніць тэрміны практыкі ў бок павелічэння, асабліва на V, апошнім курсе Беларускага універсітэта культуры. Гэта дасць магчымасць больш грунтоўна авалодаць практычнымі навыкамі работы ў аўтаматызаваным рэжыме, сканцэнтравацца на навукова-даследчай і навукова-арганізацыйнай дзейнасці будучых спецыялістаў і іх самаадукацыі, бо менавіта гэтага вопыту і ўменняў не хапае на практыцы маладым спецыялістам.

У апошнія гады побач з выкарыстаннем у якасці баз практыкі буйнейшых бібліятэк рэспублікі назіраецца размеркаванне студэнтаў па небібліятэчных установах г. Мінска, нават камерцыйных, што, на наш погляд, не спрыяе прыходу кваліфікаваных кадраў у публічныя бібліятэкі рэспублікі. У сувязі з гэтым было б пажадана больш актыўна выкарыстоўваць абласныя універсальныя бібліятэкі як навукова-метадычныя цэнтры сваіх рэгіёнаў у якасці баз практыкі. Асабліва мэтазгодным гэта бачыцца для такіх спецыялізацый, як "менеджмент і маркетынг бібліятэчнай справы" і "аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы".

На думку практыкаў, вышэйназваныя прапановы будуць спрыяць не толькі больш якаснай падрыхтоўцы спецыялістаў, але і вырашэнню праблемы забеспячэння ўстаноў культуры прафесійна падрыхтаванымі кадрамі.

**Н.У.Клімянкова,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СТУДЭНТАЎ ПАДЧАС ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ

Увага даследчыкаў падчас вытворчай практыкі ў асноўным засяроджваецца на метадычных і арганізацыйных пы-